# ТУРЫСТЫЧНЫЯ МАРШРУТЫ НАВАГРАДЧЫНЫ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

***Булаты П.Ю.,***
*малады навуковец Інстытута менеджменту спорту і турызму,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

У міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі актыўна развіваліся разнастайныя формы турызму. Органы дзяржаўнай улады усведамлялі і бачылі ў развіцці турыстычнай галіны значныя магчымасці для сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў і культурнага выхавання сацыяльных груп. Актуальнасць даследавання абумоўленая тым, што зварот да турыстычнага досведу мінулага дазволіць пераасэнсаваць сучасныя турыстычныя рэсурсы, атрымаць бачанне сродкаў выхаваўчай працы, якія выкарыстоўваліся ў міжваенны час на заходнебеларускіх землях.

Мэта даследавання – прааналізаваць турыстычныя рэсурсы, якія выкарыстоўваліся для стварэння маршрутаў па Наваградскім рэгіёне.

**Матэрыял і метады.** Матэрыяламі даследавання з’яўляюцца звесткі, якія прыводзяцца ў тэматычным турыстычным даведніку Przewodnik turystyczny po Wileńszczyźnie i Nowogródczyźnie, выдадзены ў 1934 г. (аўтар Ю. Шукевіч) [1]. У ім падаецца 8 турыстычных маршрутаў па Наваградскаму рэгіёну: 3 дэтальна апісаныя, 5 каротка анансаваныя. Маршруты ў турыстычным даведніку падрабязна апісваюцца па ўніфікаванай схеме: маршрут і яго кропкі; падрабязная лагістычная даведка (адзначаецца спосаб таго, як дабрацца да кропак маршрута), змяшчаецца расклад руху транспарту; характарыстыка і апісанне турыстычных рэсурсаў. У даследаванні выкарыстоўваліся агульналагічныя, агульнанавуковыя і спецыяльныя гістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Турыстычны даведнік, пачынаецца з уводнага артыкула, які апісвае асаблівасці рэгіёна. У ім аўтар вылучае дзве галоўныя яго асаблівасці: 1) хвалісты і пагорысты краявід, значную частку яго займаюць вялікія пушчы і лясы; 2) раскіданыя вёскі і мястэчкі з асаблівым тыпам драўлянага дойлідства. Дадаюць краявід помнікі ў мястэчках, гаспадарчыя двары і ацалелыя сядзібы.

Разгледзім падрабязней прапанаваныя турыстычным даведнікам маршруты па Наваградчыне з акцэнтам на вылучаных аб’ектах. Перад гэтым адзначым адну акалічнасць: гістарычныя факты, якія прыводзяцца ў даведніку (стылі, даты, падзеі), мы пераносім без верыфікацыі.

**1. Ліда – Наваградак – Карэлічы – Мір – Ішкалдзь** (*кропка пазначаецца ў загалоўку, але ў апісанні не прыводзіцца*) **– Нясвіж – Стоўбцы – Клецк** [1, с. 21–25].

У апісанні маршрута адзначаецца, што самым каштоўным здабыткам Ліды з’яўляюцца руіны гатычнага абарончага замка XV ст. Аўтар параўноўвае замак у Лідзе з падобнымі ў Медніках і Крэве. Наступная кропка маршрута – Наваградак, які ляжыць на пагорках (яго пагорыстыя краявіду падаюцца як славутасць). Першае, на што звяртае ўвагу даведнік, гэта руіны замка. З шэрагу помнікаў архітэктуры ў Наваградку вартыя ўвагі турыстаў: былы базыльянскі гатычны касцёл (як адзначаецца, перароблены ў праваслаўную царкву з варварскімі перабудовамі), фарны касцёл XVII ст. (узведзены па фундацыі Вітаўта, тут быў ахрышчаны А. Міцкевіч), дамініканскі касцёл з кляштарам і школай (месца навучання А. Міцкевіча), былы францысканскі касцёл з кляштарам (адабраны праваслаўнымі), сінагога, мячэць, старапольскія двары, забудова вакол Рынку ў стылі класіцызм. Далей паведамляецца, што шырокі, засаджаны паабапал бярозамі тракт прыводзіць праз Карэлічы (знакамітыя колішняй фабрыкай габеленаў) і Турэц (захаваліся часткі палацу Хадкевічаў) у Мір. Там знаходзіліся вартыя ўвагі найлепшыя і самыя вялікія ў Польшчы руіны гатычнага абарончага замка. З Міра праз Гарадзею маршрут вядзе ў Нясвіж, самым каштоўным помнікам якога, паводле даведніку, з’яўляецца даўні езуіцкі касцёл з кляштарам (заняты войскам). Аўтар адзначае, што гэта першы помнік эпохі барока ў Польшчы, пабудаваны ў 1589 г. Бернардоні, акцэнт робіцца на яго фрэсках, ляпніне, грабніцы Радзівілаў; побач з касцёлам стаіць вартая ўвагі гатычная вежа. Акрамя таго, у горадзе прапаноўваецца агледзець: касцёл і кляштар бенедыктынак і бернардынаў



Репозиторий ВГУ

(адабраны праваслаўнымі), дамініканскія муры (у іх школе навучаўся Ул. Сыракомля), ратушу з крамамі, рэшткі гарадскіх умацаванняў з слуцкай брамай, цікавую сінагогу. Таксама ў Нясвіжы даведнік прапануе наведаць барочна-рэнесансны замак, які, нягледзячы на рабункі, захаваў шмат здабыткаў – галерэі, архіў, бібліятэку. Дазвол на наведванне замку трэба было браць у маршалка замка, адзначаецца, што нават хуткі агляд можа заняць некалькі гадзін. Наступная кропка маршрута – Стоўбцы над Нёманам, былая рэзідэнцыя Чартарыйскіх. У горадзе прапаноўваецца наведаць былы дамініканскі касцёл з прыгожай вонкавай ляпнінай, былы базыльянскі касцёл (забраны праваслаўнымі) і кляштар (на той час – староства) з вялікімі сутарэннямі. Апошняя кропка маршрута – Клецк, дзе вартыя ўвагі два касцёла і сінагога.

**2. Наваградчына Міцкевіча – Свіцязь – Баранавічы** [1, с. 25].

Адзначаны маршрут – тэматычны, звязаны з мясцінамі, датычных жыцця і творчасці Адама Міцкевіча. На шляху, як адзначаецца ў даведніку, на кожным кроку сустракаюцца вобразы з паэмы «Пан Тадэвуш». Турыстам на маршруце прапаноўваецца наведаць Волкавічы (паглядзець драўляную, былую ўніяцкую царкву), парк у Тугановічах, двор у стылі класіцызм і касцёл у Варончы, двор Сапліцаў у Чамброве, Сваятычы і Сноў (палацы і касцёлы), Гарадзішча (барочны касцёл, забраны праваслаўнымі).

**3. Баранавічы – Жыровічы – Сынкавічы – Альбертцін – Слонім** [1, с. 26–27].

Апісанне маршрута пачынаецца з апісання ракі Шчары, над якой знаходзіцца горад Слонім – даўняя рэзідэнцыя Агінскіх. Адзначаецца, што ацалелі часткі іх палацу, дзе пісаў свае музычныя творы гетман М. Агінскі. У Слоніме прапаноўваецца пазнаёміцца з былым бернардынскім барочным касцёлам і кляштарам, фарным касцёлам у стылі позняга барока, касцёлам і кляштарам непакалянак, крамамі вакол Рынку, невымерна цікавай сінагогай. Наступная кропка маршрута – Жыровічы, дзе знаходзіцца былы касцёл і базыльянскі кляштар з цудадзейным абразам Маці Божай. Адзначаецца, што комплекс забраны праваслаўнымі. Альберцін – вартая ўвагі сядзіба ордэна езуітаў усходняй місіі. Апошняя кропка маршрута –Сынкавічы, дзе знаходзіцца самы стары і самы цікавы ў рэгіёне гатычны касцёл (хоць храм у Сынкавічах ніколі не быў каталіцкім, у ён даведніку пазіцыянуеце менавіта так), пабудаваны ў 1410 г.

Разгледзеўшы маршруты, абагульняючы, можна вылучыць групы турыстычных рэсурсаў Наваградчыны, якія прапаноўваюцца турыстычным даведнікам для наведвання. Так, у даведніку згадваецца 21 месца на якія прыходзіцца 49 турыстычны аб'ектаў з каторых: 1 прыродных аб'ект (воз. Свіцязь); 43 архітэктурных аб'ектаў: 12 каталіцкіх храмаў, 8 праваслаўных (былыя каталіцкія), 4 сінагогі, 1 мячэць, 3 замкі, 9 палаца-паркавых комплексаў (у тым ліку сядзібы), 6 помнікаў гарадской забудовы; 8 месцаў, звязаных з гістарычнымі падзеямі і асобамі.

**Заключэнне.** Такім чынам, разгледзеўшы турыстычныя маршруты, якія былі складзеныя па Наваградчыне ў 1930-я, можна адзначыць наступнае:

1) Зыходзячы з турыстычных рэсурсаў, на падставе якіх сфарміраваныя маршруты па рэгіёне, можна акрэсліць, што турыстычная спецыялізацыя Наваградчыны – маршруты па аб'ектах культурна-гістарычнай спадчыны (замкі, сядзібы, храмы, гарадская забудова) і мясцінах, звязаных з выбітнымі дзеячамі (найперш – А. Міцкевічам);

2) Ідэйная скіраванасць выдання і маршрутаў – выхаванне турыстаў у польскім духу, пазіцыянаванне спадчыны выключна як польскай (рэдка адзначаецца прыналежнасць аб'ектаў да Вялікага Княства Літоўскага, пра Беларусь і беларускасць гаворкі няма зусім);

3) Выбарка турыстычных аб'ектаў групы хрысціянскіх храмаў суб'ектыўная, ідэалагічна афарбаваная: прыводзяцца пераважна каталіцкія храмы альбо праваслаўныя, якія мелі каталіцкае (грэка-каталіцкае) мінулае, мелі месца фальсіфікацыі (храм у Сынкавічах).

1. Szukiewicz, J. Przewodnik turystyczny po Wileńszczyźnie i Nowogródczyźnie / Józef Szukiewicz – Wilno : Znicz, 1934. – 36 s.



Репозиторий ВГУ